Установа адукацыі

"БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА"

УДК 947.6: 339

**КАРПІЕВІЧ**
**Віктар Аляксандравіч**

# РАЗВІЦЦЁ ГАНДЛЮ Ў БЕЛАРУСІ (1861 – 1900)

07.00.02. – Айчынная гісторыя

**АЎТАРЭФЕРАТ**
дысертацыя на саіскание вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

**Мінск – 2003**

Праца выканана на кафедры гісторыі Беларусі Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік – | доктар гістарычных навук, прафесар Люты А. М. (Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка", кафедра гісторыі Беларусі) |
| Афіцыйныя апаненты: | доктар гістарычных навук Шыбека З. В. (Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт", кафедра эканамічнай гісторыі Беларусі і замежных краін) |
| | кандыдат гістарычных навук, дацэнт Жытко А. П. (Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка", кафедра славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі) |
| Апаніруючая арганізацыя - | Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры" |

Абарона адбудзецца «30» мая 2003 года ў 15.00 гадзін на пасяджэнні Савета па абароне дысертацый Д 02.21.03 пры Установе адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка" па адрасу: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 18. , ауд. 482; тэл. 220-86-33.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка".

Аўтарэферат разасланы «      » красавіка 2003 г.

Вучоны сакратар Савета
па абароне дысертацый                                        І. І. Багдановіч

2019

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Пытанні развіцця гандлю ў Беларусі ў другой палове XIX ст. даследаваны мала, таму што дадзеная праблема ў айчыннай гістарыяграфіі не была прадметам манаграфічнага вывучэння, нягледзячы на значную колькасць навуковых выданняў. У выдадзеных працах вывучаны толькі некаторыя асобныя пытанні дадзенай праблемы, у асноўным у кантэксце развіцця капіталістычных адносін.

Даследаванне ж азначанай праблемы дапамагае вызначыць стан развіцця беларускага рынку ў паслярэформенны перыяд, садзейнічае больш поўнаму вывучэнню гандлёвай дзейнасці і склада беларускага гандлёвага саслоўя. Пры гэтым нельга пакінуць без увагі і працэс фарміравання крэдытна-фінансавай сістэмы, неабходна паказаць яе ролю ў развіцці гандлю ў Беларусі ў другой палове XIX ст.

Да гэтага часу цалкам не вывучалася пытанне, звязанае з уплывам развіцця чыгункі на гандлёвую дзейнасць беларускіх губерняў. Між тым менавіта яна карэнным чынам паўплывала на заняпад старых і фарміраванне новых гандлёвых цэнтраў Беларусі. Даследаванне ролі чыгункі дазваляе высветліць працэс інтэграцыі беларускіх зямель у агульнарасійскі рынак і выхад на сусветны.

Гістарычны вопыт, праўдзівае бачанне мінулага, аб'ектыўны погляд на стан развіцця гандлёвых адносін паміж суседнімі народамі служаць лепшаму паразуменню паміж беларускім і суседнімі народамі, таму што абмен таварамі на працягу гісторыі грамадства заўсёды садзейнічаў культурнаму ўзаемадзеянню. Вывучэнне гісторыі развіцця гандлёвых адносін з'яўляецца састаўной часткай вывучэння праблемы генезісу капіталізму ў Беларусі, дазваляе зразумець сацыяльна-эканамічныя і палітычныя працэсы, адбываючыяся ў грамадстве і краіне.

**Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Даследаванне з'яўляецца часткай навуковай праблемы "Сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае развіццё Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст.", якая распрацоўваецца кафедрай гісторыі Беларусі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі – 19942102) у рамках дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь. Тэма даследавання зацверджана на Вучоным савеце БДПУ імя Максіма Танка (пратакол № 5 ад 4 сакавіка 1997 г.).

**Мэта і задачы даследавання. Мэта** дысертацыі – комплекснае і ўсебаковае даследаванне, на аснове крытычнага аналізу разнастайных крыніц, працэсу развіцця гандлю ў Беларусі ў другой палове XIX ст., выявіць яго асаблівасці і характэрныя рысы.

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

У адпаведнасці з пастаўленай мэтай аўтар вырашае ў працы наступныя **задачы**:

- паказаць развіццё таварнай вытворчасці ў Беларусі ў другой палове XIX ст;
- даследаваць стан развіцця транспарту і шляхоў зносін у Беларусі ў другой палове XIX ст. і іх уплыў на гандлёвыя адносіны;
- прааналізаваць змены, якія адбываліся ў сацыяльнай структуры насельніцтва Беларусі;
- паказаць працэс станаўлення крэдытна-фінансавай сістэмы ў Беларусі ў другой палове XIX ст. і ахарактарызаваць яе развіццё і ўплыў на пашырэнне гандлёвай дзейнасці;
- даследаваць узровень развіцця перыядычнага і пастаяннага гандлю, паказаць змены, якія адбываліся ў гандлёвай сферы Беларусі ў другой палове XIX ст.;
- вызначыць склад гандлёвага саслоўя ў Беларусі, шляхі папаўнення, крыніцы яго даходаў;
- паказаць месца беларускіх губерняў у другой палове XIX ст. у сістэме агульнарасійскага і замежнага гандлю.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ектам даследавання з'яўляецца эканамічная сфера дзейнасці грамадства. Яна ўключае ў сябе адносіны, у якія ўступаюць людзі ў працэсе іх узаемадзеяння. Важнейшымі з іх з'яўляюцца тавара-грашовыя. Прадметам жа гэтага даследавання выступаюць асаблівасці развіцця гандлёвых адносін у Беларусі ў другой палове XIX ст.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання.** Метадалагічную аснову дысертацыйнага даследавання склалі прынцыпы гістарызму і аб'ектыўнасці, каштоўнаснага падыходу да разглядаемага аб'екта. Прынцып гістарызму дыктуе вывучэнне аб'екта даследавання менавіта такім чынам, якім ён рэальна фарміраваўся ў працэсе свайго станаўлення і развіцця, у арганічнай сувязі з парадзіўшымі яго умовамі. Прынцып аб'ектыўнасці патрабуе ўсебаковага ахопу вывучаемай з'явы з улікам магчымых поглядаў па дадзенай праблеме. Каштоўнасны падыход (пры захаванні прынцыпу гістарызму і аб'ектыўнасці) дазваляе даць ацэнку вывучаемаму аб'екту як станоўчай ці адмоўнай з'яве.

Дысертант імкнуўся пазбегнуць палітызаванай інтэрпрэтацыі фактаў і суб'ектыўнай ацэнкі мінулага. Навуковы пошук пры даследаванні дадзенай праблемы насіў комплексны характар. Сапраўднасць атрыманых вынікаў забяспечваецца метадалагічнай пазіцыяй дысертанта, усебаковым аналізам вывучаных фактаў, параўнаннем іх з іншымі фактамі і суаднесна атрыманых высноў з раней вядомымі вынікамі.

Спецыфіка аб'екта даследавання, а таксама мэта і задачы, пастаўленыя ў працы, вызначылі выбар наступных метадаў гістарычнага даследавання: гісторыка-

генетычнага (вывучэнне гістарычных падзей і з'яў у працэсе іх развіцця ад зараджэння да гібелі ці сучаснага стану, што дазваляе ў найбольшай ступені наблізіцца да рэальнага гістарычнага аб'екта), гістарычна-тыпалагічнага (выяўленне агульных рыс у прасторавых групах гістарычных падзей і з'яў ці вылучэнне аднародных стадый у іх бесперапынна-часовым развіцці), гісторыка-сістэматычнага (устанаўленне функцыяніравання сувязяў гістарычных падзей і з'яў, раскрыццё механізмаў іх функцыяніравання), гісторыка-параўнальнага (параўнанне гістарычных падзей і з'яў у прасторы і часе, выяўленне падабенства і адрозненняў паміж імі).

Наяўнасць у дысертацыі вялікай колькасці фактычнага матэрыялу, выражанага ў лічбавых велічынях, абумовіла выкарыстанне метадаў статыстычнага аналізу.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** Навуковая навізна дысертацыі заключаецца ў тым, што ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі прадпрымаецца спроба markdown рознабаковага аб'ектыўнага даследавання развіцця гандлю ў Беларусі ў другой палове XIX ст. Аўтар першым правёў комплексны аналіз уплыву чыгуначнага будаўніцтва ў Беларусі ў другой палове XIX ст. на змены ў існуючых формах гандлю, на заняпад кірмашоў і пераход да стацыянарнага гандлю.

У даследаванні праводзіцца аналіз з'яў і прычын, якія паўплывалі на змены ў структуры гандлёвага саслоўя Беларусі. Вызначана месца, якое займалі беларускія губерні ў другой палове XIX ст. у сістэме агульнарасійскага і замежнага гандлю.

Далейшае развіццё атрымоўвае асвятленне ўжо закранаўшыхся аспектаў развіцця гандлю ў Беларусі, удакладняюцца раней атрыманыя высновы на аснове разнастайнага сабранага статыстычнага і архіўнага матэрыялаў, у тым ліку раней не ўведзеных у навуковы абарот.

Гэта мае важнае значэнне, таму што дазваляе ў далейшым выкарыстоўваць дадзены матэрыял не толькі пры вывучэнні разглядаемай тэмы, але і пры даследаванні іншых аспектаў эканамічнай гісторыі Беларусі.

У працэсе даследавання былі атрыманы наступныя вынікі:

- раскрыты фактары, якія ўплывалі на развіццё гандлю ў Беларусі ў другой палове XIX ст.;
- даследаваны разнастайныя формы гандлёвай дзейнасці, якія існавалі ў Беларусі;
- паказаны змены ў арганізацыі гандлю ў Беларусі ў другой палове XIX ст.;
- даследаваны гандлёвыя сувязі беларускіх губерняў з расійскімі і з замежжам.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Дысертацыя ў значнай ступені запаўняе прабелы ў вывучэнні развіцця гандлёвых адносін у Беларусі перыяду капіталізму. Матэрыялы і высновы дысертацыі могуць быць выкарыстаны

спецыялістамі, якія займаюцца праблемамі і гісторыяй эканамічнага развіцця Беларусі пры падрыхтоўцы навучальных дапаможнікаў і лекцыйных курсаў па гісторыі Беларусі новага часу, пры падрыхтоўцы спецкурсаў па эканамічнай гісторыі Беларусі.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца да абароны:**

1. Царскія ўлады праводзілі ў дачыненні да Беларусі палітыку ўціхамірвання краю. Яна праяўлялася ў тым, што ўлады не імкнуліся падтрымоўваць мясцовых вытворцаў, з недаверам адносіліся да тутэйшых памешчыкаў, не спрыялі стварэнню розных аб'яднанняў, у тым ліку і эканамічных, такіх як спажывецкія таварыствы. Палітыка царызму ў пэўнай ступені тармазіла развіццё капіталістычных адносін у Беларусі.

2. Развіццё сельскай гаспадаркі і прамысловасці Беларусі ў вывучаемы перыяд знаходзіліся на нізкім узроўні развіцця, які ўсё ж дазваляў тут існаваць ўстойліваму попыту ў маштабах беларускіх губерняў.

3. Чыгуначнае будаўніцтва садзейнічала развіццю гандлю ў Беларусі, паскарала тавараразварот, больш цесна звязвала беларускія губерні з рускімі, украінскімі, прыбалтыйскімі і Польшчай, садзейнічала пашырэнню замежнага гандлю. З развіццём чыгуначнай сеткі пачынаецца заняпад водных гандлёвых шляхоў, якія ўсё ж такі заставаліся галоўным сродкам для адпраўкі лясных грузаў. Развіццё новых транспартных сродкаў, пашырэнне тавараразвароту, рост насельніцтва гарадоў і мястэчак, павелічэнне вытворчасці патрабуе стварэння крэдытна-фінансавых устаноў. Гэты працэс пачаўся ў 70-х гг. XIX ст. і дасягнуў свайго росквіту напрыканцы стагоддзя, калі быў створаны шэраг як дзяржаўных, так і прыватных камерцыйных устаноў у галіне крэдытавання.

4. У другой палове XIX ст. канчаткова адбываецца заняпад кірмашоў. Яны альбо болей не існуюць, альбо па сутнасці ператвараюцца ў аднадзённыя базары. Назіраецца пераход ад перыядычнай формы гандлёвай дзейнасці да пастаянных стацыянарных гандлёвых устаноў. Пры гэтым колькасць гандлёвых кропак пастаянна ўзрастае. У асноўным пераважаюць дробныя лаўкі. Іх гандлёвыя абароты ў апошняй чвэрці стагоддзя ўзраслі. У гэты ж час тэмпы росту як гільдзейскіх, так і дробных (негільдзейскіх) гандлёвых прадпрыемстваў былі даволі высокімі.

5. Беларускае гандлёвае саслоўе было неаднародным. У другой палове XIX ст. доля гільдзейскіх купцоў памяншалася. Усё больш жыхароў гарадоў і мястэчак далучаліся да гандлёвай дзейнасці. Іх абароты, як і капіталы, былі нязначнымі. Па-ранейшаму пэўнае месца займалі гандляры-карабейнікі.

6. У даследуемы перыяд Беларусь заставалася часткай агульнарасійскага рынку. Дзякуючы наяўнасці чыгунак і зручных водных шляхоў яна была звязана з

важнейшымі эканамічнымі рэгіёнамі Расійскай імперыі. У 60 – 70-я гг. XIX ст. Беларусь захоўвае сваю спецыялізацыю ў якасці рэгіёна, які пастаўляў на агульнарасійскі рынак сельскагаспадарчую прадукцыю. Аднак ужо ў апошняе дзесяцігоддзе XIX ст. увоз хлеба ў Беларусь перавышае вываз. Напрыканцы стагоддзя галоўным таварам вывазу становіцца лес. У Беларусь з іншых губерняў завозяцца пераважна прамысловыя вырабы.

7. У другой палове XIX ст. наяўнасць чыгункі і блізкасць да марскіх партоў спрыяюць развіццю замежнага гандлю. Беларускія тавары з'ўляліся састаўной часткай агульнарасійскага экспарту. У асноўным за мяжу з Беларусі ішлі прадукты сельскай гаспадаркі і лес. У сваю чаргу беларускі рынак спажываў замежныя прамысловыя вырабы, прадметы раскошы і каланіяльныя тавары.

**Асабісты ўклад саіскальніка.** Увесь аб'ём даследавання па тэме дысертацыі і публікацыя атрыманых вынікаў выкананы самастойна. Аўтарам вывучаны, сістэматызаваны і прааналізаваны разнастайны фактычны матэрыял і навуковыя працы. У працэсе работы над матэрыялам складзена 33 табліцы.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Асноўныя палажэнні дысертацыйнага даследавання неаднаразова абмяркоўваліся на пасяджэннях кафедры гісторыі Беларусі, на пасяджэнні навукова-праблемнага савета гістарычнага факультэта БДПУ імя М. Танка і праца рэкамендавана да абароны (пратакол № 1 ад 2 красавіка 2003 г.). Важнейшыя палажэнні і вывады, якія тычацца праблем развіцця гандлю ў Беларусі ў другой палове XIX ст., прагучалі ў выступленнях на Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця" (3-4 мая 2002 г., г. Гродна), Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Беларуская дзяржаўнасць: вопыт XX стагоддзя" (18-19 красавіка 2003 г., г. Мінск).

**Апублікаванасць вынікаў.** Па тэме даследавання аўтарам выдадзена 9 артыкулаў у навуковых зборніках і часопісах. Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 67 старонак.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі працы, асноўнай часткі, высноў, спіса выкарыстаных крыніц і літаратуры, дадатку. Асноўная частка ўключае 4 главы. Агульны аб'ём дысертацыі складае 138 старонак. З іх 19 старонак займае спіс літаратуры і крыніц (300 назваў), а 24 - дадаткі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ПРАЦЫ

**Ва ўводзінах** акрэслены гістарычныя ўмовы развіцця гандлю ў Беларусі ў другой палове XIX ст., азначаюцца і геаграфічныя храналагічныя рамкі даследавання.

**Агульная характэрыстыка працы** змяшчае абгрунтаванне актуальнасці тэмы, яе навуковай і практычнай значнасці, паказвае сувязь працы з іншымі навуковымі праграмамі і тэмамі, якія распрацоўваюцца ў БДПУ імя Максіма Танка. Азначаны мэта і задачы, аб'ект і прадмет даследавання, метадалогія і метады, якія ўжываліся пры яго правядзенні. Характарызуюцца навуковая навізна і практычная значнасць атрыманных вынікаў. Сфармуляваны асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону. Змешчана інфармацыя аб асабістым укладзе саіскальніка ў распрацоўку названай праблемы, аб апрабацыі і апублікаванасці вынікаў дысертацыйнага даследавання, яго структуры і аб'ём.

**У першай главе "Гістарыяграфія і крыніцы"** разглядаецца стан тэарэтычнага вывучэння даследуемай праблемы развіцця гандлю ў літаратуры, характарызуюцца выкарыстаныя ў працы крыніцы.

У дасавецкай літаратуры былі спробы разгледзець пытанне аб эканамічным развіцці беларускіх губерняў, у сувязі з чым закранался і пытанне аб развіцці гандлю. Сярод тых даследчыкаў, якія разглядалі розныя аспекты развіцця гандлю можна адзначыць П.О. Баброўскага, Ю. Янсона, М. Раеўскага, А.С. Дзембавецкага, А.П. Субоціна, А. Сапунова.[1] У сваіх працах яны асвятлялі гандлёвую дзейнасць беларускіх губерняў, засяроджвалі ўвагу на лакальных асаблівасцях развіцця гандлю.

У савецкі перыяд у беларускай гістарыяграфічнай навуцы з'явіўся шэраг прац, прысвечаных эканамічнай гісторыі Беларусі другой паловы XIX ст. У асноўным гісторыкі разглядалі дадзеную праблему ў кантэксце развіцця прамысловасці и сельскай гаспадаркі Беларусі. У першую чаргу можна назваць працы М. В. Доўнар-Запольскага і Д. А. Дудкова[2], якія выйшлі ў 20 – 30-я гг. XX ст. Аднак яны ў большай ступені прысвечаны аналізу развіцця прамысловасці, гандлёвая дзейнасць Беларусі ў другой палове XIX ст. фактычна імі не вывучалася.

У пасляваенны перыяд у айчыннай гістарыяграфіі з'явіліся шэраг прац, якія ў той ці іншай ступені закранали пытанні развіцця гандлю ў Беларусі. Праблемы

---

[1] Бобровский П. Физические и нравственные элементы северо-западных губерний России // Вестник Западной России. Т. II. Кн. VI. Вильна, 1866. Янсон Ю. Э. Пинск и его район. СПб., 1869. Раевский И. Западный район экспедиции по изучению хлебной торговли и производительности России. СПб., 1876. Дембовицкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии...: В 3-х кн. Могилёв., 1884. Субботин А. П. В черте еврейской оседлости. СПб., 1888. Вып. 1. Сапунов А. Река Западная Двина. Витебск, 1893.

[2] Довнор-Запольский М.В. Народное хозяйство Белоруссии. (1861–1914) Мн., 1926. Дудкоў Д. А. Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў 2-й палове XIX ст. і пачатку XX стагоддзя. Мн., 1932.

развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы ў пасляэформенны перыяд і яе сувязі з рынкам разглядалі К.І. Шабуня, Л.П. Ліпінскі і У.П. Панюціч[1]. Развіццё прамысловасці ў Беларусі вывучаў М. Ф. Болбас[2]. Непасрэдна гандлёвую дзейнасць у Беларусі вывучаў Х. Ю. Бейлькін[3]. Аднак яго даследаванні тычацца ў асноўным развіцця сельскагаспадарчага рынку Беларусі. Асобую ўвагу заслугоўвае праца З. В. Шыбекі[4], які вывучаючы развіццё беларускіх гарадоў і мястэчак ў другой палове XIX ст., закранае і пытанні, звязаныя з гандлёвай дзейнасцю.

Акрамя буйных прац у гэты перыяд быў апублікаваны і шэраг артыкулаў. У. У. Цімашэнка, Н. І. Палятаява, В. В. Навіцкі і іншыя закранаюць пытанні, звязаныя з рознымі аспектамі гандлёвай дзейнасці[5].

Важнай крыніцай для напісання дадзенай працы сталі архіўныя матэрыялы, якія ў асноўным былі ўзяты з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Мінску і Нацыянальнага гістарычнага архіва ў г. Гродна. У НГАБ у фондах канцылярый грамадзянскіх губернатараў (фф. 295, 1430, 2001), губернскіх статыстычных камітэтаў (фф. 21, 2187, 2502), гарадскіх управ, казённых палат і падатковых інспекцый (фф. 1, 333, 358, 359, 360, 611, 2099, 2157, 2496, 2520, 2523, 2781) змешчаны звесткі, якія тычацца розных бакоў гандлёвай дзейнасці ў Беларусі. Такія ж звесткі па Гродзенскай губерні ўзяты з фондаў канцылярыі Гродзенскага губернатара, губернскага статыстычнага камітэта і казённай палаты (фф. 1, 14, 24).

Шырока выкарыстоўваліся матэрыялы, змешчаныя ў штогадовых выданнях таго часу, такія як Памятныя кніжкі Віленскага, Віцебскага, Гродзенскага, Магілёўскага і Мінскага губернатараў, Агляды Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў. У асобныя гады выдаваліся ў якасці дадаткаў да губернскіх ведамасцяў статыстычныя і даведачныя табліцы, у якіх змяшчаецца разнастайныя матэрыялы, якія тычацца развіцця гандлю.

Каштоўныя звесткі былі ўзяты са статыстычных зборнікаў, сярод іх вылучым: “Статитический временник Российской империи”, “Статистика Российской

---

[1] Шабуня К.И. Аграрный вопрос и крестьянские движения в Белоруссии в революцию 1905 – 1907 гг. Мн., 1962. Липинский Л.П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II пол. XIX в.). Мн., 1971. Панютич В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861-1900 гг. Мн., 1990.

[2] Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии: 1860 - 1900 гг. Мн., 1978.

[3] Бейлькин Х. Ю. Аграрный кризис конца XIX века и структурная реконструкция сельского хозяйства Белоруссии. Мн., 2001. Ён жа. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии. 1861 – 1914. Мн., 1989.

[4] Шыбека З. В. Гарады Беларусі (60–я гг. XIX – пачатак XX ст.). Мн., 1997.

[5] Тимошенко В. В. Кредитная система Белоруссии в начале XX века // Исторические записки. Т. 78. М., 1965. Полетаева Н. И. Из истории торговли Беларуси (80 – 90-е гг. XIX в.) //Веснік БДЭУ, 2001. № 5. – С. 66 – 72. Яна ж. Полетаева Н. И. Торговые дома Беларуси (60-е гг. XIX – начало XX в.) //Предпринимательство в Белоруссии, 2000. № 12. – С. 34 – 37. Навицкий В. В. Ярмарочная торговля Витебской губернии во второй половине XIX века // Айчынная і сусветная гісторыя: Сучасныя погляды і метады даследавання: Зб. навук. пр.: У 2 ч. Ч. 1. Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі. – Мн.: БДПУ, 2002.– С. 117 – 121.

империи", "Статистический сборник МПС", "Вестник финансов, промышленности и торговли", "Ежегодник министерства финансов", "Отчеты государственного банка", "Отчеты по операциям акционерных банков коммерческого кредита," "Акционерное дело в России", "Статистика краткосрочного кредита", "Статистические результаты процентного и раскладочного сборов за 1885-1896/98 гг.", "Торговля и промышленность Европейской России по регионам" пад рэдакцыяй С. Цянь-Шанскага ды іншыя. Цікавыя звесткі аб складзе насельніцта змешчаны ў матэрыялах, якія тычацца першага агульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі, які праводзіўся ў 1897 г. і выдадзены пад рэдакцыяй М. А. Трайніцкага.[1]

У савецкі час выйшаў шэраг прац, у якіх сабраны матэрыялы, звязаныя з эканамічным развіццём Беларусі ў другой палове XIX ст. Сярод іх асаблівую цікавасць выклікаюць "Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі","Экономика Белоруссии в эпоху империализма", "Гісторыя Беларускай ССР" у 5 т. і іншыя выданні. З апошних прац адзначым "Энцыклапедыю гісторыі Беларусі" у 6 т.

**У другой главе "Умовы для развіцця гандлю ў Беларусі ў другой палове XIX стагоддзя"** аналізуюцца палітычныя і эканамічныя фактары, якія аказвалі непасрэдны ўплыў на развіццё гандлю.

Сацыяльна-палітычныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Польшчы ў першай палове XIX ст., а таксама паўстанне 1863–64 гг. у значнай ступені аказалі ўплыў на адносіны царскіх улад да гэтых зямель. Улады з недаверам ставіліся да мясцовага насельніцтва, якое ў значнай колькасці было каталіцкім. У краі дзейнічала забарона на стварэнне рознага роду аб'яднанняў і таварыстваў, нават тых, якія мелі мэту аказання дапамогі сельскагаспадарчым вытворцам. І толькі напрыканцы 70-х гг. XIX ст. урад даў дазвол стварыць у Беларусі таварыствы сельскіх гаспадароў. Царскія ўлады не ўлічвалі і асаблівасцей сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх зямель. Чыгуначныя лініі пракладваліся згодна стратэгічных планаў урада, часта яны праводзіліся міма важных гандлёвых цэнтраў.

Царызм праводзіў асобую палітыку ў заходніх губернях і ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва. У 1791 г. была вызначана рыса яўрэйскай аседласці, у якую ўвайшлі і беларускія губерні. Існаванне дадзенай рысы вызначыла нацыянальны склад мясцовага насельніцтва. Менавіта тут была даволі высокая канцэнтрацыя яўрэйскага насельніцтва. Многія з іх былі вымушаны гандляваць, што вызначыла нацыянальны склад гандлёвага саслоўя ў Беларусі.

---

[1] Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / Под ред. Н. А. Тройницкого. Т. IV. Виленская губерния. СПб., 1901; Тетрадь 2. СПб., 1904. Тетрадь 3; Т. V. Витебская губерния. СПб., 1899. Тетрадь 1; СПб., 1903. Тетрадь 3; Т. XI. Гродненская губерния. СПб., 1904; Т. XXII. Минская губерния. СПб., 1904; Т. XXIII. Могилевская губерния. СПб., 1903.

Сельская гаспадарка заставалася ў другой палове XIX ст. галоўнай галіной эканомікі Беларусі. У гэты перыяд назіралася расшырэнне пасяўных плошчаў, прычым асноўнымі культурамі былі зерневыя. У 60 – 70-я гг. зерневы хлеб быў галоўным відам таварнай прадукцыі. У цэлым з пяці губерняў у 1875 - 1880 гг. вывозілася ў сярэднім па чыгунцы і рэках 10,8 млн., у 1882-1890 гг. - 7,5 млн., у 1890–1897 гг. - 7,8 млн. пудоў. Другой важнай культурай гандлёвага земляробства была бульба. З панскіх палеткаў бульба ішла ў асноўным на вінакурні і крухмальныя заводы. Немалаважнае значэнне як у памешчыцкіх, так і ў сялянскіх гаспадарках набыў лён. Асобае значэнне для панскіх гаспадарак мела вінакурства, якое стварыла надзейную базу для развіцця другой галіны сельскай гаспадаркі – жывёлаводства. У 80 – 90-я гг. яно стала адной з важнейшых галін сельскай гаспадаркі ў Беларусі, паколькі прадукты мяса-малочнай вытворчасці мелі высокі попыт на ўнутраным і знешнім рынках.

Немалаважную ролю ў гандлі беларускіх губерняў адыгрываў лес. Паўднёвым губерням, дзе пашыралася прамысловае будаўніцтва, неабходна была вялікая колькасць лесаматэрыялаў. Устойлівы попыт на лес быў і за мяжой, таму вываз лесу пастаянна ўзрастаў. Так, у 1895 г. з сямі паветаў Мінскай губерні было адпраўлена ў Прусію, Рыгу і паўднёвыя губерні Расіі лесу амаль на 1,5 млн. рублёў.

Самай распаўсюджанай формай прамысловасці ў Беларусі па-ранейшаму заставаліся промыслы. Надзвычайна распаўсюджанымі былі лесанарыхтоўкі, сплаў плытоў, будоўля, рамонтныя работы, праца ў млынах. Таксама назіраўся рост і колькасці рамеснікаў, асабліва ў тэкстыльнай прамысловасці. Аднак кустарныя промыслы і рамесная вытворчасць не маглі спаборнічаць з мануфактурамі, фабрыкамі і заводамі.

Немалаважнае значэнне для развіцця гандлю адыгрывае стан шляхоў зносін і наяўнасць транспартных сродкаў. У другой палове XIX ст. у Беларусі пачалося чыгуначнае будаўніцтва. Напрыканцы стагоддзя даўжыня беларускіх чыгунак складала каля 4,4 тыс. вёрст. У 80-я гг. чыгункі сталі адыгрываць у грузаперавозках больш важную ролю, чым рэкі. З канца 60-х гг. XIX ст. і да пачатку XX ст. колькасць грузаў, адпраўленых па чыгунках узрасла ў 100 разоў, а па рэках – крыху больш чым у 10 разоў.

У паслярэформенны перыяд у Беларусі адбываўся колькасны рост насельніцтва. У 1866 г. у Беларусі пражывала 3535,7 тыс. чалавек, з іх 349,9 тыс. - у гарадах, а ў 1897 г. - адпаведна 6489,5 тыс. і 648,5 тыс. Рост колькасці гарадскога насельніцтва ў значнай ступені быў звязаны з развіццём прамысловасці і чыгуначным будаўніцтвам.

Развіццё гандлёвай дзейнасці ў Беларусі патрабавала значных грашовых сродкаў. Першай мясцовай крэдытнай установай у Беларусі стаў Гомельскі гарадскі

банк, які пачаў сваю дзейнасць у 1870 г. Услед за ім ў 1873 г. быў заснаваны Мінскі камерцыйны банк. Адразу пасля свайго адкрыцця ён стаў адным з буйнейшых у Беларусі. Усяго напрыканцы XIX ст. у Беларусі дзейнічала 26 банкаўскіх установаў. З іх – 7 таварыстваў узаемнага крэдыту. У перыяд з 1881 па 1884 гг. свае аддзяленні ва ўсіх губернскіх гарадах Беларусі адчыніў Дзяржаўны банк.

**У трэцяй главе "Унутраны гандаль"** аналізуецца стан развіцця беларускага рынку, які характарызуецца ў даследуемы перыяд рознаўзроўневымі формамі таваразвароту, пры якіх тавар дасягаў пакупніка праз вялікую колькасць пасрэднікаў. Аднак ужо ў гэты перыяд пачынаюць усталёўвацца ў Беларусі новыя, больш прагрэсіўныя формы гандлю: вытворцы – аптовыя гандляры – рознічныя гандляры – спажыўцы.

У другой палове XIX ст. пачынаецца заняпад кірмашовага гандлю. У 1861 г. у Беларусі іх адбылося толькі 235 (з 256). У асноўным кірмашы працягваліся некалькі дзён, і толькі асобныя праходзілі ад двух тыдняў да месяца. Пастулова кірмашы ў многіх гарадах і мястэчках сталі замяняцца базарнымі днямі, якія праходзілі рэгулярна 2-3 дні на тыдзень. Яскравым прыкладам таму могуць служыць звесткі аб Петрапаўлаўскім кірмашу ў м. Бешанковічы. На працягу 60 – 70-х гг. прывоз тавараў на ім вагаўся ад 450 да 650 тыс. рублёў. Аднак у другой палове 80-х гг. яго абароты рэзка ўпалі, у 1887 г. склалі 75 тыс. рублёў, а ў 1894 – 5 тыс. Такое назіралася і на Васілеўскім кірмашу ў г. Гомелі, абароты якога на працягу 60 – 80-х гг. XIX ст. перавышалі 200 тыс., а ў 1899 г. склалі толькі 38 тыс. рублёў.

Будаўніцтва чыгуначных дарог дазволіла паскорыць таваразварот. На змену кірмашам ў гарадах і мястэчках прыйшоў пастаянны крамава-лавачны гандаль, што дазваляла ў поўнай ступені забяспечыць насельніцтва неабходнымі для іх жыццядзейнасці таварамі. У першай палове XIX ст. у многіх гарадах Беларусі ўжо дзейнічалі гандлёвыя лаўкі. Напачатку 60-х гг. лаўкі існавалі ўжо ва ўсіх гарадах, іх налічвалася ў 1861 г. 5,5 тыс., а напрыканцы стагоддзя - звыш 12 тыс.

З 1885 па 1898 гг. назіралася павелічэнне гільдзейскіх гандлёвых прадпрыемстваў. Пры гэтым адносны рост іх колькасці ў 1898 г. да 1885 г. склаў у сярэднім па Беларусі 147%, а гандлёвыя абароты ўзраслі на 253%. З 1889 па 1895 гг. адбываўся колькасны рост і негільдзейскіх прадпрыемстваў. У цэлым рост іх колькасці ў 1898 г. адносна 1889 г. склаў 107%. Не гледзячы на тое, што тэмпы росту колькасці гільдзейскіх прадпрыемстваў і іх абароту ў Беларусі былі даволі высокія, сярэдні гадавы абарот аднаго быў нізкім. у 1885 г. ён складаў 9,5 тыс. рублёў, у 1898 г - 16,4 тыс. Асноўную долю гільдзейскіх гандлёвых прадпрыемстваў складалі дробныя, толькі адзінкавыя мелі гадавы абарот звыш 100 тыс. рублёў. Сярэднегадавы

абарот аднаго негільдзейскага прадпрыемства складаў у 1889 г. 1,7 тыс., у 1898 г. – 2,6 тыс. рублёў.

У XIX ст. асноўная доля гандлёвага капіталу знаходзілася ў руках асобага саслоўя - купецтва. У 1861 г. у Беларусі 94% купцоў адносілася да 3 гільдыі, 4% - да 2, і толькі 2% - да 1. З мэтай узмацнення купецтва ўрад правёў у 1863 г. гільдзейскую рэформу, згодна якой скасоўвалася 3 гільдыя. У выніку праведзенай рэформы ў Беларусі назіралася памяншэнне купецкага саслоўя. Асабліва гэта адбываецца пасля 1874 г., калі было адменена вызваленне гільдзейскіх купцоў ад вайсковай службы. Таму доля пасведчанняў 1 гільдыі адносна агульнага ліку гадавых дакументаў на гандаль складала ў другой палове 60-х гг. 0,2%, а напрыканцы XIX ст. 0,4%. Нязначнай была і доля пасведчанняў 2 гільдыі, яны складалі адпаведна 5,4% і 7,3%. Значную частку складалі пасведчанні і білеты на дробны гандаль, якія ў другой палове 60-х гг. складалі каля 1/3, а напрыканцы стагоддзя – 2/3 ад усіх дакументаў.

У сярэдзіне 80-х гг. XIX ст. гандлёвыя прадпрыемствы раслі вельмі хутка, у буйных гарадах Беларусі была высокая шчыльнасць гандлёвых устаноў. Так, на 3000 хат у Мінску прыходзілася 2000 гандлёвых крамак альбо 1 на 30-35 чалавек. У той жа час у губернскіх гарадах Расіі іх прыходзілася 1 на 100-200 жыхароў. Другой асаблівасцю ў Беларусі таго часу было існаванне вялікай колькасці гандляроў-карабейнікаў альбо афеней. Афені гандлявалі ў разнос па гарадах і вёсках, галоўным чынам featureзнымі дробезямі. Кошт тавару такога гандляра-карабейніка складаў каля 6-10 рублёў, а выручаў ён за дзень 20-30 капеек.

**У чацвёртай главе "Беларускія губерні ў сістэме агульнарасійскага рынку і знешняга гандлю"** разглядаюцца пытанні, звязаныя са знешнегандлёвай дзейнасцю беларускіх губерняў у другой палове XIX ст. Асноўнымі таварамі, якія ішлі на агульнарасійскі і замежны рынак, была сельскагаспадарчая прадукцыя і лес. Прычым лес і лесаматэрыялы карысталіся вялікім попытам на знешнім рынку.

Важнейшымі гандлёвымі цэнтрамі Беларусі былі Пінск і Віцебск. Яны знаходзіліся на перакрыжаванні розных водных шляхоў, праз іх праходзіла чыгунка, што рабіла гэтыя гарады буйнымі транзітнымі цэнтрамі заходніх губерняў. Пінск быў галоўным цэнтрам гандлю з паўднёвымі губернямі. Так, у 1867 г. ад Пінскай прыстані было адпраўлена ў паўднёвыя гарады 126,8 тыс. сажняў ляснога і 10,2 тыс. пудоў іншага грузу. За тры апошнія месяцы 1866 г. ад станцыі Віцебск па ўчастку Віцебска-Дзінабургскай чыгункі ў Рыгу, Дзінабург, Варшаву, Беласток, Коўна было адпраўлена тавараў у 185,8 тыс. пудоў, а за першае паўгоддзе 1867 г. ў- 585,8 тыс. Пры гэтым толькі ў Пецярбург было адпраўлена 185,7 тыс. пудоў featureзнага грузу. У першай палове 60-х гг. штогод з Мінскай губерні сплаўлялі па Дняпру лесу і матэрыялаў на 650 тыс. рублёў. У 1887 г. па рэках Беларусі ў межах Кіеўскага

аддзялення Кіеўскай акругі шляхоў зносін грузілася і было адпраўлена 320 суднаў і 619 плытоў з грузам у 3,1 млн. пудоў. Уверх адпраўляліся зерневы хлеб, цукар, соль, а ўніз – лес і лесаматэрыялы, камень і вапна.

У 1896 г. ад станцый Лібава-Роменскай, Масква-Брэсцкай і Палескай чыгунак было адпраўлена 11,3 млн. пудоў розных лясных грузаў. У 1899 г. у пяць паўднёвых гарадоў – Кіеў, Кацярынаслаў, Крэменчуг, Чаркасы і Херсон – вадой было адпраўлена 54,8 млн. пудоў грузу, з якіх 53,8 млн. прыходзілася на лес і лесаматэрыялы. Колькасць лесу, сплаўленага па рэках у паўднёвыя губерні Расіі вырасла з 1876 па 1899 гг. у 50 разоў.

У той жа час у Беларусь у значнай колькасці прывозіліся з іншых губерняў для продажу розныя прамысловыя вырабы. На Бешанковіцкі кірмаш у Лепельскім павеце ў 1875 г. было завезена тавараў з іншых губерняў на 305 тыс. рублёў, у гэты ж год у г. Мінск было прывезена з Расіі і Польшчы тавараў на 2,2 млн. рублёў. Напрыканцы стагоддзя было завезена з іншых расійскіх губерняў 13,8 млн. пуд. мінеральных прадуктаў і металічных вырабаў, 11,4 млн. пуд. прадуктаў земляробства, больш за палову з якіх - 63% - складалі хлебныя грузы. Значную частку прывозу склалі мануфактурныя вырабы – 599,4 тыс. пудоў.

Выгаднае геаграфічнае становішча Беларусі, блізкасць да заходніх рубяжоў і да партоў Балтыйскага мора спрыяла і развіццю знешняга гандлю. Найбольшым попытам за мяжой як і ў самой Рассіі ў час прамысловага пад'ёму карыстаўся лес і лесаматэрыялы. Кошт вывезеных за мяжу з беларускіх губерняў лясных матэрыялаў складаў у канцы 60-х гг. XIX ст. каля 300 тыс. руб. срэбрам. Да канца XIX ст. продаж лесу і лесаматэрыялаў не змяншаецца. Толькі ў Магілёўскай губерні ў 90-х гг. было скуплена лесу для продажы за мяжой больш чым на 3 млн. рублёў.

Другім важным таварам, які вывозіўся за мяжу, быў хлеб. У сярэдзіне стагоддзя хлеб у асноўным адпраўляўся па рэках у Балтыйскія парты – Мемель, Данцыг і Кёнігсберг. Аднак ужо ў канцы 60-х – пачатку 70-х гг. XIX ст. хлеб усё больш сталі адпраўляць па чыгунцы. Напрыклад, з Віцебскай губерні па Дзвіне было адпраўлена ў Рыгу ў 1869-72 гг. па чыгунцы і вадой - 8125 тыс. пудоў, аднак у 80-я гг. XIX ст. вываз хлеба за мяжу памяншаецца. Гэта было звязана з падзеннем цэн на хлеб па прычыне больш таннага хлеба з Амерыкі і Аўстраліі, а таксама пасля ўвядзення ў 1887 г. Германіяй высокіх пошлін на хлеб, які ўвозіўся з Расійскай імперыі. Наогул напрыканцы стагоддзя вываз хлеба з Беларусі за мяжу быў нязначны. У гэты ж перыяд многія гаспадаркі Беларусі пачалі вырошчваць лён, які ў асноўным збываўся за мяжу, галоўным чынам у Англію і Германію.

Акрамя лесу, хлеба і льну з беларускіх губерняў за мяжу вывозіліся некаторыя іншыя сельскагаспадарчыя тавары, такія як косці, скура, воўна, сала, малочныя

прадукты, яйкі, а таксама хатняя жывёла. Продаж хатняй жывёлы за мяжу адбываўся ў асноўным у прыгранічных з Прусіяй раёнах. Вялікім попытам карысталіся свінні і коні.

З-за мяжы ў беларускія губерні ў асноўным завозілі гарбату, каву, цукар, віна, мануфактурныя вырабы, прадметы раскошы, прамысловыя вырабы. У 1875 г. у г. Мінск было завезена тавараў коштам 646 тыс. рублёў, з іх прыкладна 2/3 былі прададзены ў Мінскай губерні, а астатнія – у суседніх губернях. У гэтым жа годзе на кірмаш у м. Бешанковічы Лепельскага павету было завезена з-за мяжы тавараў на суму 212,4 тыс. рублёў.

На аснове аналізу развіцця гандлю і фактараў, якія ўплывалі на гэты працэс, зроблены наступныя <u>высновы</u>:

1. Дзяржаўная палітыка царскіх улад пасля 1861 г. па-ранейшаму была накіравана на падтрымку памешчыкаў. Тым не менш улады павінны былі рабіць захады і па падтрымцы новай сілы – нараджаючагася класа буржуазіі. Гэта было звязана і з тым, што ўсё больш памешчыцкіх гаспадарак уцягвалася ў тавара-грашовыя адносіны, памешчыкі перабудоўвалі сваю гаспадарку на новы лад.

Аднак у Беларусі існавалі пэўныя прычыны, якія аказвалі негатыўны ўплыў на гэты працэс. У першую чаргу гэта было звязана з тым, што ўлады не бачылі ў мясцовых памешчыках, большай часткай паланізаваных і сепаратыўна настроеных, сваю надзейную апору ў краі. Яскравым сведчаннем такой палітыкі стала ўвядзенне дыферэнцыраванага чыгуначнага тарыфу, які зрабіў невыгадным перавозку беларускага хлеба за мяжу. Таксама гэта ператварыла Беларусь у 80-90-я гг. XIX ст. у рэгіён, у які завозіўся танны хлеб з Расійскіх губерняў.

Другой асаблівасцю палітыкі царскіх улад у Беларусі, як і ў іншых заходніх губернях, было існаванне г.з. рысы яўрэйскай аседласці. Гэтая палітыка прывяла да высокай канцэнтрацыі яўрэйскага насельніцтва ў заходнім рэгіёне. А пасля забароны яўрэям сяліцца па-за межамі гарадоў і мястэчак і займацца сельскай гаспадаркай, павялічылася колькасць людзей, якія заняліся гандлёвай дзейнасцю. Гэта прывяло да таго, што амаль увесь гандаль у Беларусі знаходзіўся ў руках яўрэяў, прычым канкурэнцыя сярод іх узрастала, гандляры ўсё больш бяднелі, што ў сваю чаргу аказвала негатыўны ўплыў на развіццё гандлю.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў 1861-1900 гг. вызначала ўзровень унутранага і знешняга гандлю. Адмена прыгону і новая арганізацыя сельскагаспадарчай дзейнасці спрыялі павышэнню прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі. Усё больш вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі ўступалі ў тавара-грашовыя адносіны. Для збыту іх прадукцыі неабходна было расшырэнне рынку. Пры гэтым аграрны характар эканомікі Беларусі вызначаў асаблівасць фарміравання

мясцовага рынку. Ён быў у першую чаргу сельскагаспадарчым. Аднак мясцовы рынак не быў здольны поўнасцю спажываць прадукцыю. Таму важнае значэнне надавалася ўключэнню беларускіх зямель у сістэму агульнарасійскага і замежнага рынкаў.

Прамысловасць у Беларусі знаходзілася ў даследуемы перыяд на больш нізкім узроўні. Аднак мануфактурная, а затым фабрычна-заводская вытворчасць выцясняла прымітыўныя формы, такія як кустарныя промыслы і рамёствы. І хоць напрыканцы стагоддзя ў Беларусі было шмат прамысловых прадпрыемстваў, большая частка іх была звязана з перапрацоўкай сельскагаспадарчай прадукцыі і мінеральнай сыравіны. Гэта была другая асаблівасць беларускага рынку: мясцовыя прадпрыемствы не маглі цалкам забяспечыць патрэбы насельніцтва ў прамысловых таварах. Таму іх у асноўным завозілі з Расіі ды Польшчы, а таксама з-за мяжы [2, 8, 9].

2. У другой палове XIX ст. у Беларусі адбываецца бурнае чыгуначнае будаўніцтва. Чыгуначныя лініі звязалі многія беларускія гарады і мястэчкі з асноўнымі эканамічнымі рэгіёнамі імперыі, а таксама з замежжам. Дзякуючы чыгункам вялікая колькасць грузаў за кароткі тэрмін перавозілася на вялікія адлегласці. Шырокае выкарыстанне чыгунак прывяло да заняпаду тых гандлёвых цэнтраў, якія апынуліся ў баку ад новых ліній. Водныя шляхі страцілі сваё значэнне ў якасці важных гандлёвых шляхоў. У асноўным іх сталі выкарыстоўваць для сплаву лесу ў паўднёвыя гарады і часткова – за мяжу. З другога боку, некаторыя парты, праз якія прайшлі чыгункі, сталі буйнымі транзітнымі гандлёвымі цэнтрамі.

Павелічэнне насельніцтва, у тым ліку павелічэнне долі жыхароў гарадоў і мястэчак, змены ў сацыяльным складзе, наяўнасць вялікай групы войск прывяло да павышэння спросу на розныя тавары паўсядзённага попыту, а таксама на прадметы раскошы. Ёмістаць беларускага рынку дзякуючы гэтаму павялічвалася. З другога боку, гэта спрыяла таму, што ўсё больш насельніцтва стала займацца гандлем.

Рост унутранага рынку і актывізацыя гандлёвай дзейнасці і прамысловасці патрабавалі значных грашовых сродкаў. У апошняй чвэрці стагоддзя адбываецца станаўленне і развіццё крэдытна-фінансавай сістэмы. Важную ролю адыгрывалі філіялы Дзяржаўнага банка, якія былі адчынены ва ўсіх губернскіх гарадах. Акрамя іх важную ролю адыгрывалі камерцыйныя і акцыянерныя фінансавыя ўстановы, таварыствы ўзаемнага крэдыту, банкірскія канторы ды іншыя. Яны выдавалі крэдыты і пазыку пад вэксалі, каштоўныя паперы, квітанцыі і тавары [4, 8].

3. Большасць кірмашоў у Беларусі ў даследуемы час ператварылася ў звычайныя базарныя дні, абароты якіх былі зусім нязначнымі. Рэгулярныя гадавыя кірмашы захаваліся толькі ў асобных мясцінах, пры гэтым іх абароты былі

невысокімі. І паступова яны страцілі сваё значэнне. Такія буйныя кірмашы, як у м. Зэльва, Бешанковічы, Любавічы, Васілеўскі ў г. Гомелі, якія ў сярэдзіне XIX ст. мелі абароты каля 500 тыс. рублёў і вышэй, напрыканцы стагоддзя альбо ператварыліся ў звычайныя базары, альбо наогул спынілі сваё існаванне.

Новыя эканамічныя адносіны патрабавалі і развіцця новых гандлёвых устаноў. Таму ў другой палове XIX ст. крамава-лавачны гандаль выцясняе кірмашы. Пастаянна дзеючыя гандлёвыя ўстановы дазваляюць у большай ступені задавальняць патрэбу насельніцтва ў спажывецкіх таварах. Колькасць лавак увесь час узрастала, што вяло да ўзрастання канкурэнцыі. Для Беларусі ў гэты перыяд было тыпова павелічэнне негільдзейскіх гандлёвых устаноў. Гэта было звязана ў першую чаргу з тым, што тут павялічвалася колькасць людзей, якія займаліся гандлёвай дзейнасцю без выкупу гільдзейскіх пасведчанняў. З другога боку, з 1885 г. улады пачынаюць ажыццяўляць большы кантроль за дзейнасцю гандлёвых і прамысловых прадпрыемстваў. Для гэтай мэты быў уведзены дадатковы раскладачны збор на гільдзейскія, а з 1889 г. – распаўсюджваецца і на негільдзейскія прадпрыемствы. Тэмпы росту колькасці як гільдзейскіх, так і негільдзейскіх прадпрыемстваў і іх гандлёвых абаротаў былі вышэй, чым у цэлым па Расійскай імперыі. Наогул стацыянарны гандаль быў больш прагрэсіўнай формай. Неабходна адзначыць, што ў гэты ж перыяд па-ранейшаму захавалася і такая форма гандлю, як разносчыкі. Яны прадавалі дробны тавар у гарадах і навакольных населеных пунктах, аднак іх дзённы абарот не дасягаў і аднаго рубля. Напрыканцы стагоддзя сталі з'яўляцца ў Беларусі і спажывецкія таварыствы, якія абаранялі інтарэсы спажыўцоў.

Тым не менш усе тры формы гандлю – кірмашы, лаўкі і крамы і разносчыкі-карабейнікі – выконвалі сваю асноўную функцыю: у поўнай ступені забяспечвалі жыхароў Беларусі рознымі таварамі, садзейнічалі ўключэнню жыхароў Беларусі ў гандлёва-грашовыя адносіны [2, 3].

4. Безумоўна, важная роля ў арганізацыі гандлёвай дзейнасці належыла купецтву. І хоць яно было ў Беларусі нешматлікім, у іх руках знаходзіліся асноўныя мясцовыя капіталы. На працягу другой паловы XIX ст. іх колькасны і якасны склад мяняўся. Пасля гільдзейскіх рэформ 60-70-х гг. для заняцця гандлем ужо было неабавязкова набываць гільдзейскае пасведчанне. Таму гандлёвае саслоўе ў Беларусі было неаднародным. Значную частку яго складалі дробныя гандляры. Іх колькасць пастаянна ўзрастала, таму многія вымушаны былі працаваць на карысць буйных гандляроў-патронаў альбо на гандлёвыя дамы.

Доля гільдзейскага купецтва на працягу 60 - 80-х гг. XIX ст. пастаянна памяншалася. І толькі напрыканцы стагоддзя стала павялічвацца колькасць купцоў 1 гільдыі. Гэта было звязана з тым, што купцы-яўрэі 1 гільдыі мелі права па сваіх

справах ездзіць у буйныя гарады імперыі, у той час як іншым прадстаўнікам яўрэйскага насельніцтва неабходна было набываць спецыяльны дазвол.

Значная частка гандляроў у Беларусі зарабляла свой капітал на куплі-перапродажы сельскагаспадарчай прадукцыі. Яны ўлічвалі сезонныя ваганні цэн, а таксама розніцу паміж цаной на хлеб і іншай сельскагаспадарчай прадукцыяй у Беларусі і ў партовых гарадах. Тыповым для Беларусі было і ліхвярства. Гандляры давалі памешчыкам і сялянам грошы пад працэнт, а затым вымушалі іх прадаваць свой ураджай па нізкіх цэнах. Аднак у цэлым у сувязі з вялікай канкурэнцыяй сярод гандляроў, іх капіталы былі нязначнымі [2, 5].

5. Беларусь арганічна была ўключана ў сістэму агульнарасійскага гандлю. Пабудаваныя тут чыгункі дазволілі звязаць многія беларускія гарады і мястэчкі паміж сабой і з іншымі часткамі Расійскай імперыі. Многія з іх сталі буйнымі гандлёвымі цэнтрамі. У першую чаргу тут вылучаецца Мінск, які ў апошняй чвэрці XIX ст. становіцца важнейшым цэнтрам па размеркаванню тавараў не толькі для самой губерні, але і для суседніх – Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай. Аднак спецыфіка Беларусі як рэгіёна з пераважаючай ролю сельскай гаспадаркі абумовіла наменклатуру тавараў, якія вывозіліся за межы беларускіх зямель. Галоўнымі таварамі, з якімі беларускія губерні выйшлі на агульнарасійскі рынак, былі прадукцыя сельскай гаспадаркі і лес. Прамысловыя вырабы вывозіліся ў нязначнай колькасці. Гэта было абумоўлена слабасцю развіцця мясцовай прамысловасці, так як яна была звязана, галоўным чынам, з перапрацоўкай сельскагаспадарчай прадукцыі і мінеральнай сыравіны. Гэта стала прычынай таго, што беларускі рынак быў адчынены для ўвозу розных прамысловых вырабаў. Іх завозілі, у асноўным, з расійскіх гарадоў і Польшчы [4, 6].

6. Беларусь, як састаўная частка агульнарасійскага рынку, была ўключана і ў міжнародны гандаль. Чыгункі звязалі яе тэрыторыю з замежнымі гандлёвымі цэнтрамі, а таксама з марскімі портамі. Гэтаму спрыяла і наяўнасць сплаўных рэк. Аднак слабасць развіцця мясцовай прамысловасці і недахоп грашовых сродкаў не дазволілі Беларусі выйсці на сусветны рынак з гатовай прадукцыяй. Беларусь ператварылася ў аграрна-сыравінны прыдатак для замежных краін. На працягу 60 – 70-х гг. XIX ст. за мяжу вывозіліся ў вялікай колькасці зерневыя тавары. Аднак напрыканцы стагоддзя яго вываз з Беларусі ўпаў. Асноўным экспартным таварам стаў лес, а таксама некаторыя іншыя тавары сельскагаспадарчай вытворчасці – лён, мяса, масла, яйкі ды іншыя. У той жа час Беларусь стала рынкам, які спажываў замежныя прамысловыя вырабы [1, 3, 4].

Па тэме дысертацыі апублікаваны наступныя работы:


1. Карпіевіч В. А. Знешнегандлёвыя сувязі беларускіх губерняў у другой палове XIX ст. // Актуальные проблемы исследований в области гуманитарных и естественных наук: Сб. науч. ст. Мн., 1998. – С. 182 – 186.
2. Карпіевіч В. А. Дробны гандаль на Беларусі ў другой палове XIX ст. // Пытанні гісторыі Беларусі: Зб. навук. арт. / Пад агул. рэд. праф. А. М. Лютага. Мн., 1998. – С. 110 – 118.
3. Карпіевіч В. А. Кірмашы на Беларусі ў др. пал. XIX ст. // Весці БДПУ. – 1998. – № 4. – С. 80 – 86.
4. Карпіевіч В. А. Водныя гандлёвыя шляхі на Беларусі ў др. пал. XIX ст. // Весці БДПУ. – 1999. – № 2. – С. 123 – 129.
5. Карпіевіч В. А. Купецтва на Беларусі у паслярэформенны перыяд (60 – 70 – я гг. XIX ст.) // Весці БДПУ. – 2000. – № 1. – С. 128 – 134.
6. Карпіевіч В. А. Беларусь у сістэме агульнарасійскага рынку (др. пал. XIX ст.) // Весці БДПУ. – 2000. – № 3. – С. 78 – 84.
7. Карпіевіч В. А. Развіццё гандлю ў Беларусі ў другой палове XIX ст.: гістарыяграфія праблемы. // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследаванняў: Зб. нав. пр.: У 2-х частках. - Ч. 1: Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі. Мн., 2002. – С. 94 – 99.
8. Карпіевіч В. А. Прамысловасць і транспарт на Беларусі ў др. пал. XIX ст. // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследаванняў: Зб. нав. пр.: У 2-х частках. – Ч. 2: Актуальныя пытанні ўсеагульнай гісторыі і гісторыі Беларусі. - Мн., 2002. – С. 126 – 133.
9. Карпіевіч В. А. Сельская гаспадарка на Беларусі ў др. пал. XIX ст. // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследаванняў: Зб. нав. пр.: У 2-х частках. . – Ч. 2: Актуальныя пытанні ўсеагульнай гісторыі і гісторыі Беларусі. - Мн., 2002. – С. 134 – 145.

# РЭЗЮМЕ

**Карпіевіч Віктар Аляксандравіч**

**Развіццё гандлю ў Беларусі (1861 – 1900).**

**Ключавыя словы:** Унутраны і знешні гандаль, рынак, купцы, кірмашы, стацыянарны гандаль, гільдзейскія і негільдзейскія гандлёвыя прадпрыемствы, тавараабарот, крэдытна-фінансавыя ўстановы, транспарт.

**Аб'ект даследавання** – эканамічная сфера дзейнасці грамадства.

**Прадмет даследавання** - асаблівасці развіцця гандлёвых адносін у Беларусі ў другой палове XIX ст.

**Мэта даследавання** - комплекснае і ўсебаковае даследаванне, на аснове крытычнага аналізу разнастайных крыніц, працэсу развіцця гандлю ў Беларусі ў другой палове XIX ст., выявіць яго асаблівасці і характэрныя рысы.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі прадпрымаецца спроба рознабаковага аб'ектыўнага даследавання развіцця гандлю ў Беларусі ў другой палове XIX ст. Упершыню праведзены комплексны аналіз уплыву чыгуначнага будаўніцтва ў Беларусі ў другой палове XIX ст. на змены ў існуючых формах гандлю, на заняпад кірмашоў і пераход да стацыянарнага гандлю. Удакладняюцца раней атрыманыя высновы на аснове разнастайнага сабранага статыстычнага і архіўнага матэрыялаў, у тым ліку раней не ўведзеных у навуковы абарот.

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны спецыялістамі, якія займаюцца гісторыяй эканамічнага развіцця Беларусі, пры падрыхтоўцы навучальных дапаможнікаў і лекцыйных курсаў, пры падрыхтоўцы спецкурсаў па эканамічнай гісторыі Беларусі.

## РЕЗЮМЕ

**Карпиевич Виктор Александрович**

**Развитие торговли в Белоруссии (1861 – 1900).**

**Ключевые слова:** Внутренняя и внешняя торговля, рынок, купцы, ярмарка, стационарная торговля, гильдейские и негильдейские торговые предприятия, товарооборот, кредитно-финансовые учреждения, транспорт.

**Объект исследования** – экономическая сфера деятельности общества.

**Предмет исследования** - особенности развития торговых отношений в Белоруссии во второй половине XIX ст.

**Цель исследования** – комплексное и всестороннее исследование на основе критического анализа разных источников процесса развития торговли в Белоруссии во второй половине XIX ст., выявление его особенностей и закономерностей.

**Научная новизна и значимость полученных результатов.** Впервые в отечественной историографии предпринимается попытка разностороннего объективного исследования развития торговли во второй половине XIX ст. Впервые проведен комплексный анализ влияния железнодорожного строительства в Беларуси во второй половине XIX ст. на изменения в существующих формах торговли, на упадок ярмарок и перехода к стационарной торговле. Уточняются ранее полученные выводы на основе разностороннего собранного статистического и архивного материала, в том числе ранее не введенного в научный оборот.

Результаты исследования могут быть использованы специалистами, которые занимаются историей экономического развития Беларуси, при подготовке учебных пособий и лекций, разработке спецкурсов по экономической истории Беларуси.

## SUMMARY

**Karpievich Viktor Alexandrovich**

**The Development of Trade in Belarus (1861 – 1900).**

**Keywords**: home trade, foreign trade, market, merchants, stationary trade, guild and non-guild trade enterprises, commodity circulation, credit and financial esteblishments, transport.

**Object of research**: is economic sphere of human activity.

**Subject of rescarch**: is peculiarities of the development of trade relations in Belarus in the second half of the XIXth century.

**The purporose of research:** is to make complex and detailed reserches of the development of trade in Belarus in the second half of the XIXth century and to bring out its peculiarities and regulations on the basis of critical analysis of defferent sources.

**Scientific novelty and importance of the received results**: for the first time in home historiography it's made an attemrt of detailed and objective researches of the development of trade in the second half of the XIXth century. For the first time it has been made a complex analysis of the influence of railway-building on the changes in existing forms of trade, on the decline of fair trade and transition to stationary trade in the second half of the XIXth century. The conclusions received earlier are defined more precise on the basis of detailed statistical and archival matirial, including that one which hasn't been put into scientific circulation before.

The results of this research can be used by specialists deling with history of economic development of Belarus, it can be useful for preparing educational and aids lectures, for working out special courses on economic history of Belarus.

**АЎТАРЭФЕРАТ**

дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

**РАЗВІЦЦЁ ГАНДЛЮ Ў БЕЛАРУСІ (1861 – 1900).**

**Карпіевіч Віктар Аляксандравіч**

Падпісана ў друк 23.04 2003. Фармат 60 х 40 1/16.
Папера афсетная. Гарнітура школьная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 1.3. Тыраж 85 экз. Заказ 290.

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"
Ліцэнзія ЛВ № 196 ад 04.02.03. 220050, Мінск, вул. Савецкая, 18.

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка ў вучэбна-выдавецкім цэнтры БДПУ.
Ліцэнзія ЛП № 486 ад 02.04.02. 220007, Мінск, вул. Магілёўская, 37.